Зацвярджаю
Першы намеснік начальніка
галоўнага ўпраўлення па адукацыі
Брэсцкага аблвыканкама
__________ А.Ф.Жук
«___»__________2018 г.

Пісьмовая работа (дыктант) па беларускай мове
для ўступнага экзамену ў VIII клас кадэцкага вучылішча

**Варыянт 2**

## Вясна на Палессі

Вясна, пачаўшыся раптоўна, несупынна збірала сілу і ў некалькі дзён змяніла палескі краявід. Балоты абярнуліся ў суцэльныя вадзяністыя пустыні. Тут маркотна выступалі адны толькі парыжэлыя купіны з сухою леташняю травою. Голыя купкі лазовых кустоў, да палавіны залітыя вадою, ды высокія шапкі алешын, ужо выбыўшых са строю жывога жыцця, захаваўшых толькі журботна ўзнятае ўгару гнілое вецце, усім кідаліся ў вочы.

Адны толькі цёмныя пушчы захоўвалі сваю звычайную суровасць, нават няветлую панурасць, тоячы ў сваіх нетрах звярыныя логавы, непраходныя дрыгвяністыя балоты, рэчкі, азярцы, пясчаныя груды-астравы. Яны змяшчалі ў сабе цэлыя шырачэзныя рэчкі снегавой вады, якая лавінаю пералівалася з балота ў балота па цёмных нізінах, накіроўваючыся ў Прыпяць. (110 слоў)

Паводле Я.Коласа